жаніха"; вяргіня – "летняя калядная зорка", валошка – "адзіная краска, на якую глядзіць анёл перад тым, як ляцець па нябожчыка"; лілея – любімая кветка Апалінэра.

Вобраз кветкі па-свойму раскрываецца ў песеннай лірыцы Леаніда Дранько-Майсюка. На вершы паэта напісана больш як тры дзясяткі песень: "Ружа белая", "Верасень хрызантэм", "Прынц і ружа" і іншыя. Сярод іх песня на верш "У Вашым голасе квітнеюць астры…", які стаў амаль класічным.

На аснове праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы:

1. У творчасці Леаніда Дранько-Майсюка матчын агарод – гэта цэлы свет, поўны характва і таямніц, незвычайнасці формаў і колераў.

2. Кветкі не проста аздоба ў паэтычным вершы, эсэ паэта. Гэта – паэзія яго жыцця, яго душы.

3. Леанід Дранько-Майсюк – неардынарны і арыгінальны чалавек, паэт характва, прыхільнік лірыкі тонкай пачуццёвасці, уражлівай эмоцыі і вобразнасці.

Навізна работы вызначаецца спробай разгледзець вобразы кветак на прыкладзе сучаснага паэта Леаніда Дранько-Майсюка як неардынарнага і арыгінальнага чалавека, прыхільніка лірыкі тонкай пачуццёвасці, уражлівай эмоцыі і вобразнасці, які далучае непаўторную мелодыю фарбаў роднай зямлі, матчынай мовы да мелодыі еўрапейскай і сусветнай культуры.

УДК 821.161.3.633

Навуч. К.В. Кірык-Маставая
Навук. кіраўнік Л.І. Неўгень, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Скідзеля")

## ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПАЭЗІІ ЛЮДМІЛЫ КЕБІЧ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЗБОРНІКА ТРЫЯЛЕТЫ. ТЭРЦЫНЫ. РАНДЭЛІ.")

Беларуская сучасная паэзія – суквецце талентаў, якое вызначаецца самабытнасцю і непаўтарнасцю кожнага, бо кожны, паводле афарыстычнага выразу Аркадзя Куляшова, капае "рэчышча ўласнай ракі", якую скіроўвае ў акіян сусветнай культуры.

Сучасная беларуская паэзія – шматаблічная, шматфарбная, разнастайная па жанрах і стылёвай дынаміцы, пазначаная арыгінальнымі творчымі набыткамі. Цікавы і багаты свет паэзіі, у якім

раскрываецца тое галоўнае, чым жыве народ, унутранае жыццё нашага сучасніка.

Адной з асаблівасцей сучаснай беларускай паэзіі становіцца яе інтэлектуалізацыя, арыентацыя на роздумнасць, медытатыўнасць.

Вынікі творчых пошукаў паэтаў абумовілі нараджэнне новых вершаваных формаў на стыку танкі і хоку – “ахвярынкі” (разважанні пра месца чалавека ў Сусвеце і Бога – “У кожным // Адпаведна яго шчадраце // Бог расце”) і “ясачкі” Рыгора Барадуліна. Напрыклад, “ясачкі” названага паэта адначасова па будове (монастрафа з трох радкоў) нагадваюць хоку (паўтанку), а па колькасці складоў – танку: “Скон – нечаканны й чаканны плён. // Чалавек – гадзіннік, які не ведае, // На колькі Усявышнім заведзены”.

Адраджэнне адной з нетрадыцыйных і новых для нацыянальнай паэзіі вершаваных форм – паліндрома (верш, які можа чытацца ў адваротным парадку з апошняй літары (радка) да першай без змен зместу) – звязана з літаратурнай дзейнасцю Віктара Жыбуля, Пятра Васючэнкі і іншых аўтараў. Сучаснай паэзіі ўласцівы і такія вершаваныя формы, як лімэрык (анапеставае пяцірадкоўе), майстрам якога з’яўляецца Андрэй Хадановіч, пагер – вершы (кароткія тэкставыя паведамленні для пэйджэраў), напісаныя Глебам Лабадзенкам, а таксама газелі (монастрафічны лірычны верш, пабудаваны на 3-12 двухрадкоўях (бейтах, якія маюць завершаную думку і адносна самастойнае значэнне) з рыфмоўкай аа, ба, ва і г. д.) Э. Акуліна.

Сучасная літаратура характарызуецца спалучэннем рознастылёвых напрамкаў, жанрава-тэматычнай шматграннасцю, яна не толькі пазнае сучасны свет, але і прагназуе будучае, з’яўляецца дасканалай і разнастайнай у фармальных адносінах. У ёй спаборнічаюць рэалістычная і мадэрнісцкая і постмадэрнісцкая тэндэнцыі. Жанравы пошук – заканамерная адзнака сучаснай літаратуры. Адна з сучасных тэндэнцый у паэзіі – зварот да класічных вершаваных форм такіх, як санет, трыялет, актава, тэрцына, рандэлі і інш.

Паэты з пакалення “сямідзясятнікаў” актыўныя шукальнікі сваіх адметных форм выяўлення. Гэта праяўляецца і ў творчасці Л. Кебіч.

Актуальнасць работы заключаецца ў тым, што даследаванне жанравага рэчышча – гэта запатрабаваны ў літаратуразнаўстве напрамак на сучасным этапе. У гэтым напрамку мы знойдзем працы І. М. Гоўзіч “Жанравыя пошукі Анатоля Вярцінскага”, Русілка В.І. “Жанравыя пошукі ў сучаснай беларускай паэзіі”, Борсук Н.М. “Традыцыі М. Багдановіча ў сучаснай беларускай паэзіі” і іншыя.

Творчасць Л.Кебіч разглядалі Казлоўскі Р.К. "Мастацкі свет паэзіі Людмілы Кебіч", Ніна Каленчыкава "Дамінанты яе лёсу", Тарасава С.М. "Жанрава-стылёвыя асаблівасці паэм Людмілы Кебіч" (на прыкладзе зборніка "Рай для адзіноты"). Але творчасць гродзенскай паэткі ў рэчышчы цвёрдых формаў верша не вывучалася асобна.

**Мэта навуковай працы:** даследаваць жанрава-стылёвыя асаблівасці паэзіі Людмілы Кебіч (на прыкладзе зборніка "Трыялеты. Тэрцыны. Рандэлі.").

**Задачы даследавання:** – паказаць адметныя рысы паэзіі Л. Кебіч, разнастайнасць яе жанравых пошукаў;

– выявіць мастацкую адметнасць паэтычнай формы трыялета ў зборніку "Трыялеты. Тэрцыны. Рандэлі" Л. Кебіч;

– адзначыць характэрныя праявы паэтычнай формы тэрцыны ў вышэйназваным зборніку;

– паказаць мастацкую спецыфіку формы рандэля ў зборніку "Трыялеты. Тэрцыны. Рандэлі." Л. Кебіч;

**Аб'ектам даследавання дадзенай работы з'яўляюцца** паэтычныя формы ў зборніку "Трыялеты. Тэрцыны. Рандэлі." Л. Кебіч.

**Прадмет даследавання:** характэрныя адзнакі і спецыфіка мастацкага выяўлення паэтычных форм трыялета, тэрцыны, рандэля ў зборніку Л. Кебіч.

**Гіпотэза:** вершаваныя формы класічнай паэзіі маюць запатрабаванасць у творчасці прадстаўнікоў сучаснага беларускага пісьменства, якія працягваюць традыцыі папярэднікаў і развіваюць гэты напрамак надалей.

**Метадалагічнай базай** для працы паслужылі даследаванні В. Рагойшы, У. Гніламёдава.

**Метады даследавання:** тэарэтычны, апісальна-супастаўляльны, культурна-гістарычны.

**Практычная значнасць работы:** даследаваны матэрыял выкарыстаны на ўроках беларускай літаратуры, гісторыі, пазакласнай дзейнасці, з паведамленнем па дадзенай рабоце выступілі на раённай і школьнай навукова-практычных канферэнцыях, матэрыялы навуковай работы былі размешчаны на сайце Гродзенскага абласнога аддзялення Сюза пісьменнікаў Беларусі.

Работа складаецца з уступу, чатырох раздзелаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў.

Паэзія Людмілы Кебіч характарызуецца даволі высокай ступенню мастацкасці, багатым ідэйна-філасофскім зместам,

асацыятыўнай вобразнасцю, шырынёй выкарыстання мастацка-выяўленчых сродкаў.

Чуйная душа Л. Кебіч тонка ўспрымае адмоўныя і станоўчыя бакі жыцця, каханне і растанне, прыгажосць беларускай прыроды. Мастацкая тканіна рандэляў насычана мастацкімі сродкамі выразнасці: эпітэтамі, метафарамі, параўнаннямі, інверсіяй. У вершах выкарыстоўваецца паўтарэнне адных і тых жа слоў у пачатку радкоў – анафара, шматзлучнікавасць, шматпрыназоўнікавасць. Паўторы надаюць вершаванай мове асаблівую экспрэсію, узвышаюць тон, запавольваюць тэмп выказвання, робяць яго велічна-спакойным.

Л. Кебіч надае пастаянную ўвагу жанраваму пошуку, паказвае высокі ўзровень паэтычнага майстэрства, працягвае пашыраць абсягі літаратурных магчымасцяў сучаснай беларускай паэзіі.

У застыласці і статычнасці цвёрдых формаў адчуваюцца веліч, годнасць і прыгажосць. У вызначаным чаргаванні рыфмаў, пэўнай колькасці радкоў, у цвёрдай канструкцыі строфаў закладзена архітэктоніка стагоддзяў. Ужыванне класічных паэтычных формаў патрабуе ад паэта дасканалага ведання і адчуваня мовы.

Складаныя вершаформы не толькі не абмежавалі думку і пачуцці паэтэсы, але, дзякуючы ім, яны заблішчалі і заіскрыліся словамі і радкамі, як агранеexisting дыяменты.

УДК 398.4

Вуч. Н. Д. Конік, М. В. Уласевіч
Навук. кір. Г.А. Барысевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(“ДУА “Гімназія № 19 г. Мінска”)

## СУЧАСНАЕ АСЭНСАВАННЕ ВОБРАЗАЎ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ

Чым больш грамадства тэхнічна развіваецца, тым складаней звычайнаму чалавеку ўсведамляць сутнасць навуковых дасягненняў. Таму назіраецца ўзрастанне цікавасці людзей да містычнага, фантастычнага і непазнанага. На пачатку XXI стагоддзя пра гэта сведчыць увага грамадства да духоўных праблем, да таямніц чалавечай псіхікі, а таксама збліжэнне навукі, рэлігіі і міфалогіі. Традыцыйная беларуская міфалогія і сёння забяспечвае сувязь чалавека з блізкім бытавым асяроддзем.

Мэта нашай работы – даследаванне навуковых крыніц па тэме, высветленне эвалюцыі некаторых папулярных міфалагічных вобразаў,